*А. В. Сурба*

# ДУДА ЯК АТРЫБУТ САКРАЛІЗАЦЫІ

Культурная этнаграфічная спадчына Беларусі як духоўная каштоўнасць, якая забяспечвае захаванне і развіццё нацыі, да сённяшняга дня застаецца не апрацаванай і патрабуе да сябе пільнай увагі. Неабходнасць яе дасканальнага вывучэння і пераасэнсавання з сучасных навуковых пазіцый прыводзіць даследчыка да пастаноўкі ўсё большай колькасці пытанняў, звязаных з матывацыяй, узнікненнем, бытаваннем і перцэпцыяй, а таксама са знікненнем і прычынамі вяртання культурных феноменаў.

Дударская культура ў гэтых дачыненнях не выключэнне. У публікацыях беларускіх даследчыкаў (І. Назіна [1], А. Скарабагатчанка [2]) амаль нічога не прыводзіцца адносна ўзнікнення дуды, яе ўспрымання, матывацыі (уключаючы неабходнасць дэкору), а таксама знікнення. Знікненне дуды пачынаецца ў XIX ст., што апісана і зафіксавана этнографам М. Я. Нікіфароўскім [3] і іншымі беларускімі інструментазнаўцамі, але, на жаль, не тлумачацца прычыны, якія дазволілі выцесніць традыцыйны інструментарый імпартам.

Аналізуя праблему вызначэння дуды як атрыбута сакралізацыі, мы пастуліруем некалькі асноўных палажэнняў. Па-першае, культура з'яўляецца самабытнай у той ступені, наколькі доўга яна развівалася аўтахтонна. Па-другое, наяўнасць пераймання культурных элементаў не звязана з культурнай экспансіяй суседзяў, а з'яўляецца дапаўненнем перцэпцыйнай карціны свету. Па-трэцяе, наяўнасць феноменаў візуальнага, а таксама перцэпцыйнага аднаўлення, якія наўрад ці звязаны паміж сабой.

Для разумення стадый развіцця дударскай культуры ўвядзем паняцце «кола жыцця» (матывацыя, узнікненне, перцэпцыя, бытаванне, знікненне).

Такім чынам, мы паспрабуем з сучасных уяўленняў падыйсці да «дударскай праблемы» і тэзісна апісаць працэсы, якія маглі паўплываць на «кола жыцця» старажытнага інструмента дуды.

Праблемы матывацыі застаюцца бадай самымі складанымі, бо іх існаванне трэба выводзіць тэарэтычна. Яны не сустракаюцца ў старажытных тэкстах, а таксама не выяўляюцца ў іканаграфіі. Таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разгледзім адну агульную канцэптуальную мадэль і будзем рухацца да ўласнага «феномена дуды».

Як вядома, гісторыя, мастацтва, філасофія развіваюцца пэўнымі рытмамі і перыядамі [4]. Іх хістанні могуць не супадаць паміж сабой, што з'яўляецца досыць складанай задачай іх вызначэння. Таму паслядоўная сістэмнасць назіраецца ў невялікіх (у кантэксце гісторыі) перыядах. Звернемся да адной з такіх мадэляў, прадстаўленай у дыхатаміі *сакралізацыя – секулярызацыя*. Гэтая мадэль паўстала пад уплывам старажытных цывілізацый, такіх як Старажытны Егіпет, а таксама Вавілона і Акадзіі [5].

Адкуль узяліся гэтыя дыхатамічныя ідэалістычныя прынцыпы? Яны паўсталі на глебе канцэптуальнага вывучэння стражытных крыніц (пераважна антычных), большая частка якіх уяўляе свецкі характар. Але, нягледзячы на тое, што яны амаль не захавалі рэлігійнай (сакральнай) складаючай, уплыў на свецкую літаратуру (а значыць, на філасофію і мастацтва) у значнай ступені прысутнічае. Гэта дае падставу рабіць вывады пра стройную і распрацаваную сістэму рэлігійнай сакральнай думкі.

*Сакралізацыя* (ад лац. sacrum – святое, супрацьпастаўленае свецкаму, матэрыяльнаму) – надзяленне прадметаў, аб'ектаў, працэсаў і інш. святым сэнсам, звязаным з асаблівай праявай боскай волі. *Секулярызацыя* – гэта працэс адваротны; працэс разумення рэлігійнасці як спецыфічнай сістэмы палітыкі, пабудаванай на прынцыпах дэмакратыі [6]. Першапачаткова такая мадэль разгледжвала антычную гісторыю, потым гэтыя катэгорыі экстрапаліраваліся на паняцці свецкага і сакральнага ў досыць вузкім сэнсе: царква і ўлада (сёння існуюць паняцці «секулярнасць царквы» і «сакральнасць улады»).

Прасачыць перыяды і эвалюцыю мыслення, як нам падаецца, можна, абапіраючыся на некаторыя «маркерныя» факты з гісторыі мастацтваў, філасофіі і сацыяльнай думкі.

Антычнасць, па меркаванні Ф. Ф. Зялінскага, пакінула нам больш яскравых сведчанняў гэтай дыхатаміі. Звернемся да асноўных перыядаў:

*1. Ахейскі перыяд* (да VII ст. да н.э.) характарызуецца гамераўскай паэзіяй, максімальна секулярызаваны.

*2. Элінскі перыяд* (VII–VI стст. да н.э.) даводзіць сакралізацыю да яе вышэйшага праяўлення: развіваюцца храмавая архітэктура, сакральная скульптура, жывапіс, дэльфійскае жрэцтва, культ алімпійскіх багоў, містычныя рэлігіі Дземетры і Дыяніса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3. Атычны перыяд* (V–IV стст. да н.э.) – найбольш плённы і значны ў гісторыі антычнай культуры. Паварот у бок секулярызацыі. Архітэктура ставіць свецкія задачы, скульптура ўвасабляе не толькі багоў, але і атлетаў, і выдатных дзеячаў. Пачынаюць распаўсюджвацца блізкаўсходнія культы. Развіваецца класічная філасофія, зараджаецца сучасны рацыяналізм.

*4. Элііністычны перыяд* (каля I ст. да н.э.) – перыяд максімальнай сакралізацыі рэлігійнай думкі. Нараджэнне дзвюх містычных плыняў: неаплатанізму і хрысціянства.

*5. Перыяд імператарскага Рыма* (каля II ст. н.э.) адзначаецца частковым зваротам да страчанай секулярызацыі.

*6. Пачатак хрысціянскага перыяду* (пачатак Сярэднявечча, VI ст. н.э.) характарызуецца зваротам да сакралізацыі [5].

Для таго, каб уявіць больш яскрава і ў духу антычнай вобразнасці гэтыя хістанні, мы звернемся да канцэпцыі філосафа Ф. Ніцшэ. Ён прапанаваў разглядаць мастацкую думку праз прызму дзвюх асноўных мастацкіх ідэалістычных плыняў: дыянісійскі і апаланічны пачаткі. Апалон – гэта нябесны, сонечны бог, сын Зеўса, які ўвасабляе сонечны пачатак, носьбіт боскай волі: «Апалон – бог усёй моцы, творачы вобразамі, ёсць у той жа час і бог, які кажа ісціну, прарочыць будучыню». Дыяніс – насупраць, пачатак зямнога, бог урадлівасці, гаспадар расліннасці, земляробства, вінаграднай лазы ды вінакураў, а таксама таямнічасці, містычнасці [7]. Дыяніс – бог вяселля, радасці і буйства. Хоць міфы і расказваюць нам, адкуль з’явіліся гэтыя багі, можна прасачыць іх карані.

Ад пачатку ахейскага перыяду Грэцыя заставалася досыць секулярызаванай, таму з’яўленне тут прататыпа Апалона – Геліуса – заканамерна. Але, пачынаючы з элінскага перыяду, у культах Грэцыі з’яўляецца ўсходняя містычнасць з Вавілона ды Акадзіі [5].

Адным з першых бажэстваў эпохі сакралізацыі стаў Пан – казлападобны сатыр, што грае на флейце-сірынзе. Культ Дыяніса пайшоў з Фракіі ад бога Адона, альбо Адоніса, гэта было, магчыма, звязана з культам егіпецкага Атона, увасабляючага цяпло і жыццёвую энергію [8]. Тут паўстаюць вельмі важныя акалічнасці: калі адзін – увасабленне моцы, святла і дарычнасці, а другі – творчага экстазу, таямнічасці і жыцця, то па такім жа прынцыпе і падзяліўся іх уплыў на мастацтва і музычныя інструменты ў прыватнасці. Сімвалам Апалона з’яўляецца струнная кіфара, альбо ліра, а сімвалам Дыяніса лічыцца духавая сірынга, альбо флейта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пана. Пачатак Апалона – закон, перамога. Пачатак Дыяніса – містычны экстаз. Становіцца відавочна, што сакралізацыя – гэта праява дыянісійскага пачатку, а секулярызацыя – апаланічнага. Гэтыя пачаткі праявіліся і праяўляюцца ў еўрапейскім мастацтве, закранулі філасофскую думку, а таксама традыцыйную культуру.

Такім чынам, на падставе канцэптуальнага асэнсавання міфалогіі можна лічыць, што ўзнікненне духавых інструментаў звязана з архетыпам Дыяніса [9] і эпохай, альбо эпохамі сакралізацыі. Сапраўды, флейта Пана з'яўляецца ў міфах якраз адначасова з міграцыяй культу Дыяніса з Усходу ў Грэцыю. Хаця там і прысутнічалі прадыянісійскія культы, культ Дыяніса аб'яднаў іх у агульны вобраз. Даследчыкам невядома, што дакладна зрабіў Пан з чароту – сірынгу, альбо аўлас, але мы можам разглядаць гэты факт як сведчанне ўзнікнення прататыпа дуды ў заходняй цывілізацыі.

Зыходзячы з нашага другога пастулата, адзначым, што распаўсюджанне дуды, альбо яе прататыпа па Еўропе не насіла агрэсіўны характар, хутчэй суседнія народы маглі прымаць і пераймаць дуду, маючы пры гэтым падобныя матывы. Тут варта прыгадаць вобраз казы, альбо казла (Пан, Селен, Дыяніс), наяўнасць некалькіх іграючых трубак, а таксама галоўнай іграючай часткі – чаротавага пішчыка.

Найбольш яскравым пацвярджэннем можа служыць тыпалогія дуд Усходняй Еуропы, якія з'яўляюцца часткай агульнаеўрапейскай тыпалогіі дуд з цыліндрычным каналам і адзінарным чаротавым пішчыкам [10]. Насупраць, дуды заходняй групы характарызуюцца канічным каналам, што тлумачыцца пранікненнем на Захад усходняй традыцыі грання на зурне [10].

Пытанне бытавання дуды ў Беларусі досыць дакладна апісана М. Я. Нікіфароўскім [3], у Польшчы – Я. Петрушынскай [11], у Чэхіі – П. Чыпам і Р. Клапкам [12] і інш. Аналіз літаратуры дазваляе вылучыць некаторыя агульныя асаблівасці, уласцівыя ўсходнееўрапейскай дударскай традыцыі:

1) самастойнае майстраванне дуды;
2) ахвярныя матэрыялы (скура, дрэва, пяро);
3) дапасаванасць да сонечнага і месяцовага календароў;
4) сакральнасць дударскай музыкі.

Трэба таксама адзначыць немалаважны факт канфлікту духавой формы са струннай. Неаднаразова Нікіфароўскі паказвае канфлікт паміж дударом і музыкай («скрыпаком»). Відавочна, канфлікт базіруецца не на музычным успрыманні і формах, а на перцэпцыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матывацыі. Наяўнасць канфлікту ўказвае на сакральны характар музычных інструментаў. Хутчэй за ўсё гэтыя два пачаткі (струнны і духавы) служаць розным мэтам. На нашу думку, духавая традыцыйная музыка атаясамліваецца з сакралізацыяй, альбо з сакральным актам (містэрыі, набажэнствы, святы). Таму канфлікт мае месца быць, хоць не зразумелы на першы погляд з пункту гледжання выканальніцкай практыкі.

Працэс знікнення дударскай традыцыі пачаўся ў XIX ст. і досыць пераканаўча фіксуе замену дуды скрыпкамі, гармонікамі, кларнетамі. Нікіфароўскі заўважае, што моладзь прываблiваюць фабрычныя інструменты [3]. Гэта досыць зразумела. Землі Беларусі на той час уваходзілі ў склад Расійскай імперыі, якая набірала моц на міжнароднай арэне. Як і Рымская імперыя ў часы найбольшай магутнасці і моцы, яна знаходзілася на стадыі секулярызацыі (у тым ліку і царквы). Таксама трэба прыгадаць еўрапейскія тэндэнцыі: навукова-тэхнічную рэвалюцыю, рост пазітывісцкай навукі, дамінаванне рацыяналізму. У такіх умовах сакральныя матывы размываюцца і ад былога прызначэння застаецца толькі форма. Засталася форма, форма дуды, але не яе сэнс. Дудары ўжо тады гралі музыку для «танцаў», а таксама некаторы скрыпічны рэпертуар: полькі, кадрылі і інш. [13]. У такіх умовах канкурэнцыя з «секулярнымі інструментамі», якія насілі свецкі, забаўляльны характар і мелі больш тэхнічных магчымасцей, была проста немагчымай. Неаднаразова ўпамінаюцца дудары «нелюдзімыя», якія жылі самі па сабе, відаць, не знаходзілі сабе таго самага сакральнага прымянення.

Такім чынам, мы разгледзелі паняцце «кола жыцця» элемента традыцыйнай культуры – дуды. Пабудаваная мадэль базіруецца на пэўных пастулатах і гістарычных звестках. Сучасны працэс рэвіталізацыі дуды прыводзіць да думкі, што матывацыяй для з’яўлення гэтага інструмента павінна быць «містычнасць», а можа нават і «містэрычнасць» як антытэза крызісу пазітывісцкай навукі, крызісу рацыяналізму, што вядзе да новага вітка сакралізацыі.

Адраджэнне дуды распачалося як адыход ад сучасных музычных плыняў, магчыма, ужо неадпавядаючых патрэбам слухача, на падставе рэканструкцыі форм, на якіх дуда спыніла сваё развіццё (пачатак XX ст.). Тады ўзнікае вельмі важнае пытанне. Ці з’яўляецца адыход ад свецкасці і паварот да сакралізацыі прынцыпова новым этапам развіцця культуры, альбо з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працягам мінулага? Мы лічым, што зараз адбываецца працэс асэнсавання, альбо пачатак перцэпцыі феномена культуры дуды.

Робячы вынікі, трэба сказаць, што працэсы асэнсавання і вывучэння феномена традыцыйнай культуры дуды носяць прынцыпова важны характар як частка ідэнтыфікацыі беларускай культуры, як унутры яе, так і за яе межамі. Факты паўтору і звароту да каранёў прыводзяць да думкі Ф. Ніцшэ аб «вечным вяртанні». Магчыма, «кола жыцця» будзе «круціцца», пакуль мы не зразумеем сакральны код.

---


1. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск: Беларусь, 1997.

2. *Скарабагатчанка, А. В.* Беларускія народныя музычныя інструменты ХХ стагоддзя: вучэб. дапам. / А. В. Скарабагатчанка. – Мінск: Беларус. навука, 2001.

3. *Никифоровский, Н. Я.* Очерки Витебской Белоруссии. II. Дударь и музыка // Этнографическое обозрение. – М., 1892. – Кн.13-14. – № 2-3.

4. *Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби. – М.: Айрис Пресс, 2002.

5. *Зелинский, Ф. Ф.* Эллинская религия / Ф. Ф. Зелинский. – Минск: Эконом-пресс, 2003.

6. *Философский* словарь / А. П. Алексеев, Г. Г. Васильев [и др.]; под ред. А. П. Алексеева. – М.: Изд. группа «Проспект», 2009.

7. *Ницше, Ф.* Рождение трагедии из духа музыки / Ф. Ницше. – М.: Азбука-классика, 2003.

8. *Иванов, Вяч.* Дионис и прадионисийство / Вяч. Иванов. – СПб.: Алетейя, 1994.

9. *Юнг, К. Г.* Душа и миф: шесть архетипов / К. Г. Юнг. – Киев: Государственная библиотека Украины для юношества, 1996.

10. *Baines, A.* Bagpipes. Pitt Rivers museum Univercity of Oxford / A. Baines. – Oxford: Oxprint Ltd of Oxford, 1960.

11. *Pietruszynska, J.* Dudy Wielkopolskie / J. Pietruszynska. – Poznan: Institut zachodnio-slowianski uniwesytetu poznanskigo, 1936.

12. *Cip, P.* Dudy v Cechach, na Morave a ve Slezsku / P.Cip, R.F.Klapka. – Brno: Salve Regina, 2006.

13. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник. Вып. 8: Вымирающий инструмент / Е. Р. Романов. – Вильно, 1912.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ